# РАБОТА З ТЭКСТАМ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Даўгулёва Ірына Аляксееўна,***
*старшы выкладчык кафедры педагогікі і прыватных методык ДУА “Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”*

Для паўнавартасных зносін чалавек павінен валодаць цэлым шэрагам уменняў: хутка і правільна арыентавацца ва ўмовах зносін, умець спланаваць сваю прамову, знайсці адэкватныя сродкі перадачы думкі і атрымаць зваротную сувязь.

Практыка паказвае, што ўрокі беларускай мовы не заўсёды адносяцца да ліку любімых у вучняў, вельмі часта адсутнічае камунікатыўная матывацыя, што перашкаджае ажыццявіць навучанне мове як сродку зносін.

Фарміраванне моўнай, камунікатыўнай кампетэнцый адбываецца ў працэсе работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы як у малодшых, так і ў старэйшых класах. Работа з тэкстам на ўроках роднай мовы стварае ўмовы для ажыццяўлення функцыянальнага падыходу пры вывучэнні лексікі, марфалогіі, фразеалогіі, сінтаксісу, для фарміравання ўяўленняў аб моўнай сістэме, рэалізацыі прадметных і метапрадметных сувязей мовы і літаратуры, гісторыі і краязнаўства, музыкі і мастацтва і г.д.

Тэкст – асноўны кампанент структуры падручніка па беларускай мове, менавіта праз тэкст рэалізуюцца ўсе мэты навучання ў іх комплексе: адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая. Паводле тэкстацэнтрычнага падыходу, выкарыстанне тэкстаў як асноўнага дыдактычнага матэрыялу з’яўляецца абавязковай умовай урока як рускай, так і беларускай мовы. Тэксты служаць узорам і стымулам для пабудовы самастойнага выказвання, дэманструюць функцыянаванне моўных адзінак усіх узроўняў.

На ўроку беларускай мовы неабходна арганізоўваць работу з тэкстам як асноўнай лінгвадыдактычнай адзінкай, тым самым накіроўваць дзейнасць школьнікаў на выпрацоўку практычных навыкаў пісьмовага і вуснага маўлення. Пры вывучэнні тэмы “Тэкст і яго асноўныя прыметы” ў VII класе можна выкарыстаць тэкст з дапаможніка В. А. Ляшчынскай [3].

*Печ – увасабленне дамашняга ачага, месца знаходжання духа (ахоўніка) дома і гаспадаркі Дамавіка. Пры закладванні печы часта збіралі талаку, запрашаючы пераважна моладзь. Закладванне печы прымяркоўвалася да поўні і лічылася, што печ будзе трымаць цяпло ва ўсіх сваіх частках. Калі першы раз палілі ў печы, абавязкова ў яе трэба было ўсыпаць дзевяць жменяў зерня, ад чаго сценкі пакрываліся слоем глянцу, да якога пазней не прыставаў куродым.*

*Улазіны спраўляліся толькі пасля таго, як была зроблена печ. Іншы раз печ рабілі з ляжанкай (грэць косці старым жыхарам хаты). Беларусы адносіліся да яе, як да жывой істоты.*

Пасля прачытання вучням прапануецца даказаць, што прачытаны ўрывак з'яўляецца тэкстам, назваць асноўныя прыметы тэксту (тэматычнае адзінства, з тлумачальнага слоўніка прывесці тлумачэнне лексічнага значэння слова печ). Далей прапаноўваецца скласці план, выпісаць ключавыя словы.

Загадзя падрыхтаваны вучань можа агучыць сціслую інфармацыю пра некаторыя незразумелыя словы: *талака, глянец, куродым, улазіны, ляжанка.* Для выканання наступнага задання клас можна паздзяліць на групы і прапанаваць выпісаць з тэксту прыклады беларускамоўных з'яў: *аканне, яканне, дзеканне, цеканне.*

З мэтай удасканалення практычных навыкаў вуснага маўлення вучняў прапануецца пераказаць тэкст па памяці, карыстаючыся планам. Высокаматываваным вучням настаўнік можа прапанаваць у якасці дамашняга задання падрыхтаваць пісьмовае паведамленне на адну з тэм: "Печ – неад'емная частка беларускай хаты", "Якія стравы можна падрыхтаваць у печы?", "Покуць – самае сімвалічна значнае месца ў беларускай хаце". Астатнім вучням можна прапанаваць заданне, якое пашырыць веды аб гісторыі свайго краю. Напрыклад: карыстаючыся інфармацыйнымі крыніцамі інтэрнэту знайсці і запісаць у сшытак прымету ці павер'е, звязанае з печчу. (*Якая б ні рабілася печка, цагляная ці "бітая" з мятай гліны, уперамежку з камянямі пад яе належала пакласці тоўчанага шкла, каб лепш пякліся хлеб і пірагі* [3]. *Гэты звычай і сёння ўжываецца ў навакольных вёсках Гомеля.*)

На аснове тэксту можа ажыццяўляцца вывучэнне такога раздзела беларускай мовы, як фразеалогія. "У аснове фразеалагізмаў ляжыць вобраз з жыцця народа, ён прачытваецца і ўспрымаецца дзякуючы культурным ведам чалавека, што жыве ў пэўным прыродным і сацыяльным асяроддзі. І менавіта вобразная аснова фразеалагізмаў – адзін з асноўных спосабаў увасаблення агульначалавечай і нацыянальнай культуры". Прапануем вучням тэкст.

*Дзяжа – драўляная пасудзіна з клёпак для заквашвання цеста. Адной з прычын, што ў дзяжы не ўдаваўся хлеб, лічылася колькасць клёпак – драўляных дошчачак, з якіх гэта дзяжа рабілася. Калі гэта колькасць была цотнаю, то пасудзіна называлася словам ж. роду – дзяжа, дзежка; калі ж колькасць клёпак была няцотнаю, то гэта быў дзеж, дзяжун. Супрацьпастаўленне добрай дзяжы, у якой удаецца хлеб, і дрэннай, у якой ён не «нараджаецца», замацавалася ў мове адпаведна ў словах жаночага і мужчынскага роду. Вядомы былі выпадкі, калі дзежуна «ператваралі» ў дзяжу, для чаго ўстаўлялі недастатковую клёпку (У. Коваль)* [2].

Заданні, якія можна прапанаваць класу для выканання:

1. Растлумачце сэнс фразеалагізма «Клёпкі ў галаве не хапае».

(*Так кажуць пра дурнаватага, з дзівацтвамі чалавека*) [1].

2. З якімі народнымі ўяўленнямі можа быць звязана паходжанне гэтага фразеалагізма?

*(У неўрадлівага дзежуна не хапала адной клёпкі для таго, каб стаць добрай дзяжой)* [1].

3. Растлумачце сэнс прыказкі: *Каб на таку было ўмалотна, у дзяжы – падыходна*. Запішыце словазлучэнні са словам дзяжа.

Праз тэксты вучні далучаюцца да ведаў, да разнастайных звестак, назапашаных чалавецтвам, што асабліва важна для падрыхтоўкі і ўдзелу вучняў у сацыяльным жыцці. Цікавы тэкст задавальняе пазнавальны інтарэс, удакладняе маральна-этэчную пазіцыю дзяцей.

Яшчэ больш стымулююць камунікатыўна-пазнавальную дзейнасць навучэнцаў дыктоўкі са змяненнем тэксту (творчыя, свабодныя, адноўленыя, дыктоўкі па аналогіі, дыктоўкі з працягам).

Дыктоўка з працягам для вучняў VI класа. Прачытайце тэкст.

*Сыны полацкага князя Усяслава Чарадзея кіравалі рознымі гарадамі. Пры неабходнасці браты злучалі свае дружыны і разам адстойвалі незалежнасць Полацкага княства. Сярод нашчадкаў Усяслава было нямала храбрых воінаў і таленавітых палкаводцаў. Але найбольшую славу пасля князя Чарадзея прынеслі Беларусі не воіны.*

*Гэта зрабіла яго ўнучка Ефрасіння. Адна старажытная кніга называе Ефрасінню арлом, які праляцеў па небе ад захаду да ўсходу і прасвятліў нашу зямлю, як сонечны прамень. За што заслужыла яна такія прыгожыя словы? (У. Арлоў)* [4].

Заданні, якія можна прапанаваць класу для выканання:

1. Прадоўжыце тэкст, адказаўшы на пытанне, сфармуляванае ў другім абзацы (без падрыхтоўкі).
2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.
3. Растлумачце правапіс уласных назоўнікаў.
4. Выпішыце з тэксту словазлучэнні, у склад якіх увадзяць назоўнкі, прыметнікі.
5. Успомніце з гісторыі, хто такая Ефрасіння? Чым гэтая жанчына вядома на Беларусі?
6. З дапамогай тлумачальнага слоўніка растлумачце значэнне слова *нашчадкі.*
7. Дома падрыхтуйце працяг аповеда пра Ефрасінню Полацкую (не больш за 10 сказаў). Аповед можна падмацаваць ілюстрацыямі.

Сучасны настаўнік ва ўмовах увядзення новых адукацыйных стандартаў выкарыстоўвае сістэмна-дзейнасны, кампетэнтнасны падыход у навучанні школьнікаў. Рэалізацыя дадзеных падыходаў на ўроку прымушае настаўніка перабудаваць сваю дзейнасць, адысці ад звыклага тлумачэння і даць навучэнцам самастойна, у пэўнай паслядоўнасці адкрыць для сябе новыя веды і ўключыць іх у сваю сістэму ведаў. Менавіта вучні з'яўляюцца галоўнымі "дзеючымі героямі" на ўроку. І, безумоўна, іх дзейнасць павінна быць асэнсаванай: што я хачу зрабіць, як я гэта раблю і дзеля чаго. Пры гэтым ўрок захоўваецца як форма арганізацыі навучання, але абнаўляюцца прыёмы і сродкі навучання праз стварэнне на розных этапах урока маўленчых сітуацый, пашыраецца ўжыванне сучасных тэхналогій. Настаўніку, які арганізуе работу з тэкстам, неабходна ўвесь час павышаць свой прафесійны ўзровень з дапамогай метадычнай літаратуры. Спіс

рэкамендацыйнай літаратуры па азначанай тэме прыводзіцца пасля спісу выкарыстаных крыніц.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Зелянко, В. У. Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10 – 11 класы : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Зелянко. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 136 с.

2. Коваль, У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. – Гомель : Беларус. агенцтва навук.-тэхн. і дзелавой інфармацыі, 1995.

3. Ляшчынская, В. А. Арфаграфія і пунктуацыя сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапаможнік / В. А Ляшчынская, М. У. Буракова, З. У. Шведава. – Мінск : РІВШ, 2014. – 278 с.

4. Міхайлаў, П. А. Беларуская мова: Дыктанты, пераказы, пераклады: 7-ы кл. : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў / П. А. Міхайлаў, С. І. Фацеева. – Мінск : Аверсэў, 2002. – 208 с.

## Спіс рэкамендаванай літаратуры

1. Васюковіч, Л. С. Фарміраванне прадметных і метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў сродкамі ўніверсальнага вучэбнага тэксту (на матэрыяле сучасных падручнікаў беларускай мовы) : манаграфія / Л. С. Васюковіч. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2021. – 224 с.

2. Васюковіч, Л. С. Спосабы рэалізацыі метапрадметнага патэнцыялу вучэбнага тэксту падручніка : метадычныя рэкамендацыі / Л. С. Васюковіч // Беларуская мова і літаратура. – 2021. – № 7. – С. 53–57.

3. Зелянко, В. У. Навучанне арфаграфіі беларускай мове ў 5–11 класах: тэорыя і практыка : манаграфія / В. У. Зелянко. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2016. – 194 с.

4. Казачэнка, І. Р. Тэкстацэнтрычны падыход як неабходная ўмова фарміравання камунікатыўнай кампэтэнцыі вучняў / І. Р. Казачэнка // Роднае слова. – 2016. – № 7. – С. 54–56.

5. Капцюг, І. Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі на занятках па беларускай мове / І. Капцюг // Роднае слова. – 2021. – № 7. – С. 65–68.

6. Литвинко, Ф. М. Лингводидактические и психолого-педагогические предпосылки изучения русского языка на текстовой основе / Ф. М. Литвинко // Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин : материалы 3-ей Межд. научн. конф. : в 2 ч. – Ч. 2. – Мозырь : УО МГПУ, 2005. – С. 110–112.

7. Рачэўскі, С. Тэкст як полідыдактычная адзінка навучання беларускай мове ў школе / С. Рачэўскі // Роднае слова. – 2021. – № 5. – С. 63–65.

8. Сілюк, Н. У. Працуем з тэкстам на ўроках беларускай мовы ў 6 класе : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / Н. У. Сілюк. – Мазыр : Выснова, 2019. – 38 с.

9. Шамова, Т. И. Сущность и структура учения как специфическая форма познавательной деятельности / Т. И. Шамова // Наука. Управление. Образование. – 2021. – № 2. – С. 15–28.

10. Якуба, С. М. Комплексная праца з тэкстам на ўроках падагульнення і сістэматызацыі ведаў / С. М. Якуба // Актуальныя праблемы развіцця сучаснай методыкі выкладання беларускай мовы : Зб. арт. чытанняў, прысвеч. памяці д. пед. н., праф. В. У. Протчанкі). – Мінск : НІА, 2003 – С. 51–57.